Бібліятэка АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ! | ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# БОЛЬШЭВІК

Орган Капаткевіцкага РК КП(б)Б

№ 19 (761) | Субота, 4 верасня | 1943 г.

**Доблесныя совецкія воіны гоняць ворага на захад, вызваляючы дзесяткі гарадоў і тысячы населеных пунктаў ад фашысцкай погані. Партызаны і партызанкі! Мацней удары па ворагу з тылу!**

## Загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

### Генерал-палкоўніку тав. ТАЛБУХІНУ

Войскі Паўднёвага фронта ў рэзультаце жорсткіх баёў разграмілі таганрогскую групіроўку немцаў і сёння, 30 жніўня, авалодалі горадам **Таганрог**. Гэта новая перамога, атрыманая нашымі войскамі на Паўднёвым фронце, дасягнута ў рэзультаце смелага манеўра конных і механізаваных злучэнняў, якія прарваліся ў тыл варожых войск. У рэзультаце праведзенай аперацыі нашы войскі поўнасцю вызвалілі Растоўскую вобласць ад нямецкіх захопнікаў.

У баях за вызваленне Растоўскай вобласці і горада Таганрога адлічыліся кубанскія казакі — кавалерысты гвардыі генерал-лейтэнанта Кірычэнка, танкісты—сталінградцы, гвардыі генерал-лейтэнанта танкавых войск Танасчышына, войскі генерал-лейтэнанта Цвецаева, генерал-лейтэнанта Захарава, генерал-лейтэнанта Герасіменка, генерал-лейтэнанта Хаменка і лётчыкі генерал-лейтэнанта авіяцыі Хрукіна.

У азнаменаванне вызвалення Растоўскай вобласці і горада Таганрога прысвоіць найменаванне „ТАГАНРОГСКІХ“: 130 стралковай дывізіі, 416 стралковай дывізіі, якая састаіць з азербайджанцаў, і ў далейшым іх іменаваць:

130 Таганрогская стралковая дывізія;

416 Таганрогская стралковая дывізія.

У чэсць перамогі пад Таганрогам сёння, 30 жніўня, у 19 гадзін 30 мінут сталіца нашай Радзімы Масква салютуе нашым доблесным войскам, якія вызвалілі Растоўскую вобласць і горад Таганрог, 12 артылерыйскімі залпамі з 124 гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні аб'яўляю падзяку ўсім кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў аперацыях па вызваленню Растоўскай вобласці і горада Таганрога і, ў першую чаргу, 130 Таганрогскай стралковай дывізіі палкоўніка Сычова, 416 Таганрогскай стралковай дывізіі палкоўніка Сызранава, 15 механізаванай брыгадзе маёра Татірава, 6 гвардзейскай танкавай брыгадзе палкоўніка Жыдкова, 32 Гвардзейскай танкавай брыгадзе палкоўніка Грыневіч, 4 механізаванай брыгадзе палкоўніка Епаншына, 9 Гвардзейскай Кубанскай кавалерыйскай дывізіі генерал-маёра Татарынава, 30 кавалерыйскай дывізіі генерал-маёра Галоўскага, 31 гвардзейскаму стралковаму корпусу генерал-маёра Утвенка, Гвардзейскім кулямётна-артылерыйскім батальёнам 1-ага ўмацаванага раёна палкоўніка Саксеева, 2 Гвардзейскай артылерыйскай дывізіі палкоўніка Алексеева, 236 знішчальнай авіяцыйнай дывізіі палкоўніка Кудрашова, 270 бамбардзіровачнай авіяцыйнай дывізіі палкоўніка Чучэва, 9 гвардзейскаму знішчальнаму палку падпалкоўніка Маразава, 31 Гвардзейскаму знішчальнаму палку маёра Ерэміна.

Вечная слава героям, паўшым у барацьбе за свабоду нашай Радзімы.

Смерць нямецкім акупантам!

**Вярхоўны Галоўнакамандуючы**
**Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН**

30 жніўня 1943 года.

---

## Ельненскія, Глухаўскія, Рыльскія і Сеўскія дывізіі, танкавыя і артылерыйскія злучэнні

Загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза тав. Сталіна 29 Гвардзейскай Чырвонасцяжнай стралковай дывізіі, 76 стралковай дывізіі, 25 Гвардзейскай танкавай брыгадзе, 26 Гвардзейскай танкавай брыгадзе, 23 Гвардзейскай асобнай танкавай брыгадзе і 119 асобнаму танкаваму палку, якія адлічыліся ў баях пад горадам Ельня, прысвоена найменаванне „ЕЛЬНЕНСКІХ“.

Дывізіям, танкавым і артылерыйскім злучэнням, якія найбольш адлічыліся ў баях пад Глухавам, Рыльскам і Сеўскам, прысвоена найменаванне—

„ГЛУХАЎСКІХ“: 70 Гвардзейскай Чырвонасцяжнай стралковай дывізіі, 226 стралковай дывізіі, 23 танкавай брыгадзе, 1 Гвардзейскай артылерыйскай дывізіі.

„РЫЛЬСКІХ“: 121 стралковай дывізіі, 112 стралковай дывізіі.

„СЕЎСКІХ“: 69 Чырвонасцяжнай стралковай дывізіі, 60 стралковай дывізіі, 103 танкавай брыгадзе, 43 механізаванай брыгадзе, 255 асобнаму танкаваму палку, 68 пушачнай артылерыйскай брыгадзе і 100 Чырвонасцяжнай артылерыйскай брыгадзе вялікай магутнасці.

Войскам, якія ўдзельнічалі ў баях пад Ельняй, Сеўскам, Глухавам і Рыльскам, за выдатныя баявыя дзеянні і ўменне манеўрыраваць аб'яўлена падзяка.

# На франтах Айчыннай вайны

## (Агляд за дэкаду)

### На Паўднёвым фронце

Нашы войскі Паўднёвага фронта ў рэзультаце жорсткіх баёў разграмілі таганрогскую групіроўку немцаў і 30 жніўня авалодалі горадам ТАГАНРОГ. Нашы войскі занялі звыш 150 населеных пунктаў, у тым ліку раённыя цэнтры Анастасьеўск, Фёдараўка, буйныя вузлы супраціўлення Пакроўская, Троіцкая, Нікалаеўская, Ламакіна, Вясёлая-Вазнесенская і другія, а таксама станцыю Куцейнікава. Такім чынам, Растоўская вобласць поўнасцю вызвалена ад нямецкіх захопнікаў. Рэшткі часцей разгромленай таганрогскай групы праціўніка былі акружаны нашымі войскамі, і 1 верасня закончылася іх ліквідацыя.

У рэзультаце наступлення нашых войск і ліквідацыі таганрогскай групы праціўніка разгромлены 17, 111, 294 пяхотныя і 15 авіяпяхотная нямецкія дывізіі. Нанесены цяжкія страты 304, 306, 336 пяхотным і 18 танкавай дывізіям праціўніка. У баях нашымі войскамі знішчана: самалётаў праціўніка—212, танкаў—537, гармат усіх калібраў—494, кулямётаў—1500, аўтамашын—3600, складаў з гаручым—10, складаў з боепрыпасамі—29. Праціўнік страціў толькі забітымі звыш 35.000 салдат і афіцэраў. Па няпоўным даным, нашымі войскамі ўзяты наступныя трафеі: танкаў—95, гармат рознага калібра—198, мінамётаў—217, кулямётаў—409, аўтамашын—594, складаў з боепрыпасамі—22. Узята ў палон 5.100 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Працягваючы наступленне, войскі паўднёвага фронта прасунуліся ўперад і занялі звыш 280 населеных пунктаў, у тым ліку ў Данбасе гарады КРАСНЫ ЛУЧ, СНЕЖНАЕ, ЛІСІЧАНСК, ВАРАШЫЛАЎСК, ЧЫСЦЯКОВА, НОВЫ ДАНБАС, ПРОЛЕТАРСК, ВЕРХНЯЕ, ПАПАСНАЕ, ПЕРВАМАЙСК, ІРМІНО, КАДЗІЕЎКА, ПАРЫЖСКАЯ КОМУНА, ЗУГРЭС, а таксама рад буйных населеных пунктаў і чыгуначных станцый.

Нашы войскі, наступаючыя ўздоўж пабярэжжа Азоўскага мора, занялі горад БУДЗЁНАЎКА.

### На Смаленскім напрамку

На днях войскі Заходняга фронта перайшлі ў наступленне на СМАЛЕНСКІМ напрамку і, прарваўшы сільна ўмацаваную абарону праціўніка працяжэннем па фронту больш 50 кіламетраў, прасунуліся ўперад ад 15 да 30 кіламетраў. 30 жніўня нашы войскі авалодалі важным апорным пунктам абароны Смаленскага напрамку—горадам ЕЛЬНЯ. Нашымі войскамі за 7 дзён баёў занята звыш 570 населеных пунктаў, у тым ліку горад ДАРАГАБУЖ, чыгуначныя станцыі Тэрэніна, Карабец, Жоглаўка, Калошына, Дарагабуж (Паўночны), умацаваныя пункты Белы Холм, Міцішкіна, Юшкава, Бывалкі, Главец, Жаб'е, Каменец, Кошалева, Варaксіна, Парубань, Уварава і раённы цэнтр Сафонава.

### Паўднёвее Бранска

Нашы войскі, наступаючыя паўднёвее Бранска, прасунуліся ўперад і занялі звыш 400 населеных пунктаў, у тым ліку гарады СЕЎСК, КАМАРЫЧЫ.

### На Цэнтральным фронце

На днях войскі Цэнтральнага фронта таксама прарвалі сільна ўмацаваную абарончую паласу праціўніка ў раёне Сеўска працяжэннем па фронту 100 кіламетраў і, імкліва развіваючы наступленне, прасунуліся ўперад да 60 кіламетраў, уступіўшы ў Паўночную Украіну. 30 жніўня нашымі войскамі заняты гарады ГЛУХАЎ і РЫЛЬСК. За 5 дзён баёў нашы войскі вызвалілі ад нямецкіх захопнікаў звыш 200 населеных пунктаў, у тым ліку раённы цэнтр Сумскай вобласці Чырвонае, раённы цэнтр Курскай вобласці Крупец, чыгуначныя станцыі Холмаўка, Эсмань, Клевень.

2 верасня нашы войскі авалодалі важным абласным цэнтрам на Украіне горадам СУМЫ, а таксама горадам КРАЛЕВЕЦ, райцэнтрам у Сумскай вобласці Ямполь і райцэнтрам у Курскай вобласці Глушкова. Такім чынам, Курская вобласць поўнасцю вызвалена ад нямецкіх захопнікаў.

### На Канатопскім напрамку

3 верасня нашы войскі на КАНАТОПСКІМ напрамку прасунуліся ад 15 да 25 кіламетраў і занялі звыш 100 населеных пунктаў, у тым ліку гарады ШОСТКА, ВАРОНЕЖ-ГЛУХАЎ, ПУЦІВЛЬ, БЕЛАПОЛЬЕ, горад і чыгуначны вузел ВАРАЖБА, а таксама рад буйных населеных пунктаў і чыгуначных станцый.

### Заходнее і паўднёва-заходнее Харкава

У раёне заходнее і паўднёва-заходнее Харкава нашы войскі вялі наступальныя баі і, прасунуўшыся ўперад, занялі рад населеных пунктаў, у тым ліку горад ЛЮБОЦІН.

* * *

За 10 дзён, з 24 жніўня па 2 верасня, нашы войскі на ўсіх франтах падбілі і знішчылі 1046 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 663 самалёты праціўніка.

* * *

Авіяцыя Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота патапіла ў Балтыйскім моры 2 транспарты праціўніка, агульным водазмяшчэннем у 13.000 тон. Авіяцыяй Чорнаморскага флота патоплены 2 быстраходных дэсантных баржы, моташхуна і старажавы катэр праціўніка.

## ВОЙСКІ САЮЗНІКАЎ ВЫСАДЗІЛІСЯ Ў ІТАЛІІ

3 верасня англійскія і канадскія войскі пад камандаваннем генерала Эйзенхаўэра высадзіліся на паўднёвым узбярэжжы Італіі.

Рэдакцыйная калегія

Выданне Капаткевіцкага РК КП(б)Б